Віктар Шніп

# Інквізіцыя

Вершы

Маладэчына
2002

x x x

За вакном Еўропа, белы свет.
Кашляе за сценкаю сусед.
Вецер за вакном. Ахвота спаць,
Толькі гэтак можна ўсё праспаць.
Ціха свечка на вакне гарыць.
Можна выпіць, можна ўсё прапіць.
Трэба жыць і бачыць далягляд,
А каб бачыць, трэба выйсці з хат...
За вакном Еўропа, родны край.
І камусь тут пекла, а камусь тут рай.

х х х

Я грэшны, як вада, дзе спіць атрута,
І мне святым ніколі ўжо не стаць,
Ды я хачу таксама быць пачутым
Людзьмі і Богам, што на свет глядзяць,
Дзе я жыву і радасці не знаю,
Дзе я люблю і ненавіджу свет,
Што да канца ніколі не спазнаю,
Бо гэты свет-- не дым ад цыгарэт,
Што мы з табой, самотныя, курылі
У цеснай кухні і пілі віно,
І свет з няведама чаго тварылі
Хоць гэты свет нам створаны даўно.
Я грэшны, як вада, дзе спіць атрута,
І мне святым ніколі ўжо не стаць.
Жыве ўва мне, як смерць мая, Іуда,
Што знае час, калі мяне прадаць...

## БАЛАДА ПРА СОНЦА

...І сонца патухне, як свечка ў царкве,
І цемра, як дым, у наш свет наплыве,
І свет наш патоне, як камень цяжкі
У чорнае плыні чарнюткай ракі,
Калі ён прачнецца і сонна ўздыхне,
І ў небе пабачыць, нібыта ў вакне,
Вялікае сонца, што столькі шукаў
На шэрай зямлі сярод пылу і траў.
Ды спіць ён, як мёртвы, як цень ад крыжа,
Як кропля крыві на спакоі нажа,
Наўзбоччы сцяжыны, наўзбоччы жыцця
На дзідах травы і на крылах лісця,
Што светла зляцела ад дыху вятроў
З зажурана-ціхіх, як вечар, кустоў.
І покуль ён спіць я куплю пісталет,
Застрэлю яго і ўратую ўвесь свет.
І людзі, забойцу, убачаць мяне,
І кожны, забойцу, мяне пракляне,
І буду я смерці, як волі, шукаць,
І свечку,
як сонца,
прад сном задзімаць...

## У СВЯТЫ ВЕЧАР

Нікуды з Храма не спяшацца, нібы спаць
І ў сне, нібы чарвяк у кокане, пачаць
Вясновы ўзлёт у неба матыля малога,
Самотны ўзлёт душы бязбожнае да Бога.

Нікуды з Храма не спяшацца, бо ёсць Храм
І гэты дзень, што светлы, быццам бы віно
Царкоўнае, якое сёння выпіць нам,
Нібыта зазірнуць у боскае вакно.

Нікуды з Храма не спяшацца, як згараць
На інквізітарскім агні сярэднявечча.
Нікуды не спяшацца, нібы ў гэты вечар
З апосталамі Біблію пісаць...

## БАЛАДА ЗДРАДНІКА

Табе забытая Айчына,
Нібы забітая жанчына,
Бывае, мроіцца ў начы.
Ты крыжык носіш, як ключы,
Якімі ўсё ж не адамкнуць
Той свет, дзе ў радасці жывуць,
Якой нам век не зразумець,
І нам, як матылям, ляцець
Туды на хмельнае святло,
Дзе ўсё сыходзіць у Было,
Як гэты дзень, як тая ноч,
Як слёзы залатыя з воч
Ад сонца, што для ўсіх адно,
Як родны дом, дзе ў рай вакно,
З якога раю не відаць,
А птушкі, што і тут ляцяць,
Нібы забытая Айчына,
Нібы забітая жанчына...

х х х

Там, дзе вецер па вуліцах гоніць смяццё,
Там не наша жыццё, там не наша жыццё,
Бо мы знаем, што мы, як на травах раса,
Як у полі пустым маладая лаза,
Што пад ветрам згінаецца аж да зямлі,
Ды расце, як заўсёды тут лозы раслі.
І мы пойдзем з табою па полі пустым
І ўсё будзе навокал самотна-чужым,
Бо мы знаем, што мы, як на травах раса,
Як у маці ссівелай на вейцы сляза,
Праз якую яна на дарогу глядзіць,
Над якой толькі вецер, бывае, ляціць,
Ну а так аніхто там не едзе, не йдзе,
Ну а хто калі пойдзе—як пыл прападзе.
І ніхто анічога не зможа сказаць,
Толькі вочы памерлых услед паглядзяць...

## ЧОРНАЯ БАЛАДА

Чорнае сонца над полем плыло,
Быццам люстэрка таго, што было,
Быццам забітае слова “люблю”
Ціха пакінула нашу зямлю
І над зямлёю, як прывід, плыве,
Не разумеючы, што не жыве,
Як не жыве пад нагамі лісцё,
Колер згубіўшы і стаўшы смяццём...
Чорнае сонца над намі плыло,
Быццам з далёкіх планет НЛО,
Быццам бы поўная бочка віна,
Быццам бы наша з табою вясна,
Чорным быллём засяваючы час,
Чорнаю кропкаю стала для нас...
Чорнае сонца над светам плыве.
Мы, як мурашкі ў высокай траве,
Сонца не  бачым, бо сонца, як дым,
Вочы нам слепіць, пакуль што жывым...

## ЗІМОВАЯ БАЛАДА

*Людміле*

Жывыя... Жывыя... Жывыя...
А вецер за вокнамі вые
І снег, быццам белы пажар,
І ў снезе, як прывід, ліхтар
На вуліцы белай стаіць.
Мы дома. Нам хочацца жыць,
Як снегу, што з неба ляціць
На кветкі жывыя... Жывыя,
Нібы матылі мы начныя
З апаленым крыллем... Жывыя...
А некаму смешна да слёз,
Што я табе кветкі прынёс
Жывыя... Жывыя... Жывыя,
Нібыта анёлы ручныя,
Бялюткія ружы. Жывыя.
А вецер за вокнамі вые
І снег, быццам вечны пажар,
І мы далятаем да хмар
Жывыя... Жывыя... Жывыя
І гэтаму свету чужыя,
Як кветкі зімою жывыя...
Жывыя, як словы святыя,
Як Аве Марыя, як Аве Марыя...

## БАЛАДА НОЯ

Мне ў каўчэзе Ноевым сярод патопу
Доўга снілася спакусна па начах
Залатая, быццам бы агонь, Еўропа,
Шэрая, як попел на пустых палях.
Мы плылі няведама куды праз вецер
І здавалася, што абмануў нас Ной
І ніхто не застанецца ў гэтым свеце,
Ну а з нас ніхто не трапіць нат і ў той.
І глядзеў я ўдалячынь, нібыта ў прорву,
Чорную, бясконцую, нібыта сон,
І глядзеў на Ноя, як кароль на торбу,
У якога слугі адабралі трон.
І плылі мы доўга, і плылі мы вечна,
І сваю Еўропу кожны адшукаў,
Шлях каўчэга ў моры
стаўся Шляхам млечным
І каўчэг у небе, як анёл, прапаў...

І гляджу я ў неба, і чакаю Ноя,
І мне часта сніцца доўга па начах
Мора, быцам бы вуголле, залатое,
Шэрае, як попел на пустых палях...

x x x

Не хочацца думаць, што мы ўсе памром,
Труна ў зямлі знікне, бы ў моры паром,
Якому хоць плач, а было не даплыць
Да тых астравоў, дзе бясконца нам жыць
Было абяцана няведама кім
Ці д"яблам прыгожым, ці Богам самім.
Не хочацца думаць, а хочацца жыць,
Дзяўчат і віно, і Айчыну любіць
І ведаць, што вечнасці ў свеце няма
І смерць не пакліча, смерць прыдзе сама,
Як самі прыходзяць зноў думкі аб тым,
Што ў свеце мы гэтым аб волі крычым
І волі не знаем, бо мы ўсе памром,
Як свечкі, патухнем пад Боскім дажджом...
Не хочацца думаць, а хочацца жыць
І мора жыцця, нібы мора, любіць...

х х х

Лета праходзіць, нібыта цягнік,
Хутка і шумна, і міма мяне.
Следам за летам ляціць востры крык
Спуджаных птушак, што плакалі ў сне,
Сніўшы пра восеньскі дождж у начы,
Дождж, ад якога сябе не схаваць.
Плакалі птушкі на дрэвах сплючы,
Плакалі птушкі, каб заўтра спяваць,
Бо не канчаецца з летам жыццё,
Бо не канчаецца ў Бога наш час.
Кволыя мы, як на дрэвах лісцё,--
Вецер зрывае і кідае нас
Следам за летам, як за цягнікОм
Хуткім і шумным, што міма мяне
Зноў пралящеў і апалым лістом
Ціха ляжу я і ў небе-вакне
Бачу зноў птушак, што ў вырай лятуць
Па-над зямлёю, дзе хутка снягі
Лісце апалае пазамятуць...
Можа зноў я, а мо нехта другі
Будзе ў захмарнае неба глядзець,
Лета чакаць, як чакаць цягніка,
Будзе які зноўку міма ляцець
Гэтых лясоў і мяне, як лістка...

## У ДОМЕ ТВОРЧАСЦІ

За вокнамі зноўку высокія сосны,
Як год і як пяць, як і дзесяць таму.
І вецер між соснаў лагодны і грозны
Лятае, прысніўшы ў начы зноў зіму,
Калі тут не будзе зусім анікога
І дом гэты будзе, як прывід, стаяць
У лесе, у снезе ля тлумнай дарогі,
Дзе толькі дарога адна і відаць...
За вокнамі зноўку высокія сосны,
Дзе можна забыцца, што ёсць на зямлі
Наш горад стамлёны, дзе рана ці позна
Мы будзем ізноўку, як вечна былі,
І будзем глядзець зноў на гмахі старыя,
І марыць зноў з"ехаць ад тлуму далей
Да цішы, да ветру, дзе сосны жывыя
Жывей за самотных, як цені, людзей..

За вокнамі зноўку высокія сосны
І вецер між соснаў лагодны і грозны
Лятае, прысніўшы ў начы зноў зіму,
І ты не зайздросціш ні кроплі яму...

x x x

Вечар затапіла навальніца.
І ліхтар пад вокнамі баіцца
Утапіцца, бо зусім адзін,
Рыжы, як савецкі апельсін.
Я праз шумны райскі лес дажджу
На дарогу, як раку, гляджу,
Па якой сплывае ў небыццё
Адзінокае, як мы, лісцё,
І за ім мне хочацца паплыць,
І пра смерць спакойна гаварыць,
Як пра сон, які прысніцца ўсім,
Таямнічы, як Ерусалім.
Сціхне дождж і раніца ўсплыве,
Загарацца свечкамі ў траве
Кветкі мокрыя, як вочы маці,
І адразу пасвятлее ў хаце,
І захочацца ізноўку жыць,
І пра смерць зусім не гаварыць...

х х х

Шагал над Віцебскам начным лятае,
Пакінуўшы, нібыта рай, Парыж.
І нехта, гледзячы з вакна, пытае:
"Чаго, габрэй, ты нада мной ляціш?.."

А ён маўчыць, бо ён лятае ў небе
Над нашым тлумам, смехам і слязьмі.
Мы думаем аб солі, вінах, хлебе,
Не хочам быць савецкімі людзьмі.

Шагал над Віцебскам начным лятае,
Як белы воран над сваім гняздом,
Які даўно тут пра жыццё ўсё знае,
Які лятае так, як мы жывём...

х х х

...Пацяплела і хочацца жыць,
Як праспаламу п”яніцу піць,
І любіць гэты свет за святло,
Што праз шыбы ў пакой зацякло
І напоўніла снегам душу...
І ўжо сумна камусь без дажджу.
Пацяплела і хочацца жыць,
І пра восеньскі дождж гаварыць,
Як пра сон, што прысніўся і знік,
Як апошні ў сяле бальшавік,
Што любіў самагон і жанчын.
Пацяплела і ты-- не адзін,
Пацяплела і хочацца жыць
І няма каму морду пабіць
За самоту, якая была
І па вокнах свінцова цякла.

х х х

У гэтым дні хачу я затрымацца,
Бо гэта ў нас з табой апошні дзень,
Калі шчэ можам у раку ўглядацца,
Дзе стронга, быццам бы анёльскі цень.
У гэтым дні хачу я затрымацца,
Нібы адстаць з табой ад цягніка,
Паліць касцёр і ў дыме цалавацца,
І ў лесе, нібы ў вечнасці, блукаць
І ведаць, што нішто не застанецца
У гэтым дні, які ў нябыт ідзе...
Хлапчук, нібыта чарцянё, смяецца,
Пускаючы караблік па вадзе,
Каля якой стаім, нібы малыя,
Якія вераць, што запыняць час.
А час ідзе,
рака нам ногі мые,
Змываючы адсюль, як попел, нас.

х х х

Вось і сонца за сосны зайшло,
Быццам бы і зусім не было.
І ў цямноцці ўтанула зямля,
І самотным адчуў сябе я,
Як вугельчык у прыску сівым,
Як над прыскам узветраны дым.
Мне праз гэта цямноцце ісці,
Як траве праз асфальт прарасці,
Каб сустрэцца з табой у вясне,
Як з табой сустракаюся ў сне...

Вось і сонца за сосны зайшло.
І блішчыць, як разлітае шкло,
У цямноцці, бы ў травах, рака,
Бы твая з бранзалетам рука,
Да якой мне прыпасці і піць
Цеплыню, без якой мне не жыць
У цямноцці, дзе знікла зямля,
Дзе самотным адчуў сябе я,
Як ля сцежкі пахілены крыж,
Як у неба закінуты глыж...

x x x

Па Кальварыйскіх могілках хаджу.
Крыжы, як райскі сад, што без дажджу
Даўно счарнеў, але трымае сум
Над травамі, дзе спее мёртвы шум,
Які патоне ў крыках варання
У цемнаце, не прычакаўшы дня...
Стаіць касцёл, нібы агонь з зямлі
Прарос і скамянеў, і прараслі
На ім крыжы, нібыта божы шлях,
Якім ісці з крыжамі на плячах
І грэшным людзям, і яшчэ святым,
Знікаючы, нібы ад свечак дым,
У гэтым свеце, дзе сярод магіл
Жывём, нібы на сцежках боскіх пыл.
Па Кальварыйскіх могілках хаджу
І жыць хачу,
і жыць хачу...

## БАЛАДА АПОШНЯГА КНЯЗЯ

Апошні князь у замку белым
Жыццё пацiху дажываў.
Яго багацце ўсё струхнела,
І ў куфрах вырасла трава.
Заіржавелі меч і латы,
І ўкралі цыганы каня.
І прывіды жылі ў палатах--
Князёва змерлая радня.
І ён сядзеў каля каміна,
Агню памерці не даваў.
І пра халопскую дзяўчыну
Начамі вершыкі пісаў.
Яе на кірмашы заўважыў.
Ды толькі князю не раўня
Халопка, што ля печы ў сажы,
На вуліцы ў гразі-- штодня.
Гарбату піў, гуляў у карты
І марыў з”ехаць за мяжу,
Але ўздыхаў, казаў: “Не варта...
Пара ўжо ратаваць душу...”
І Біблію чытаў памалу,
Глядзеў, што ў пекла, у камін.
І ціха свечка дагарала
У цішы будучых руін.

## БАЛАДА АЙЧЫНЫ

--Не хадзі ты ў поле, бо там смерць гуляе,
А ідзі ў карчомку, там віно чакае...
Толькі ён нікуды не пайшоў з хаціны,
І смяяліся над ім усе жанчыны.
А адна маўчала і слязу губляла,
І ад слёзаў ейных крапіва завяла,
Што спавіла сцежку да хаціны ціхай,
Дзе хадзіла шчасце, дзе сягоння ліха,
Сеўшы на каменне, хітра паўтарае:
--Не хадзі ты ў поле, бо там смерць гуляе,
А ідзі ў карчомку, там віно чакае...

І пайшоў па сцежцы весела хлапчына,
І куды ён прыйдзе-- будзе там Айчына.

ВЫКРАДАННЕ КАХАНАЙ

Збудую паветраны замак,
Анёлы паселяцца ў ім.
Ты будзеш у замку таксама,
Ты будзеш у сэрцы маім.

На лютнях зайграюць анёлы,
І ўспыхнуцца ружы наўкол.
І раю блакітныя пчолы
Нам свечкі паставяць на стол.

І будзе наш замак праз ружы
У небе, як мроіва, плыць.
Нам хмараў вандроўныя сцюжы
З табой, як санэты, любіць.

Паветраны замак збудую
Над садам-- кляштарам тваім.
Цябе я ўкраду, пацалую,
І ў неба, як сон, паляцім.

x x x

Трэба весела жыць!

Сумна жыць-- бы глядзець на дарогу,
На якой анікога няма
І не будзе, напэўна, нікога,
Бо ўжо вечар і хутка зіма.
Сумна жыць-- бы маліцца ля Храма,
Ад якога цяпер-- толькі яма
І нічога, нічога няма.
І глядзіш ты, адзін, на дарогу,
І знікае дарога, як дым,
Што ляціць да аблок, як да Бога
Мы штохвілі дыханнем ляцім
Праз самоту, жыццём што завецца,
Што са снегам у дом нанясецца
І растане, і знікне, як дым.
Сумна жыць-- бы ўміраць на чужыне,
Дзе нікому няведамы ты,
Нават сумнай, як ружа, жанчыне
І не ведаць, што ёсць шчэ жыццё,
Як віно пад сталом у графіне.

## БАЛАДА ЛЁСУ

Можа заўтра, мо праз год, праз дзесць,
Ды ўсё роўна ўсё ж цябе павесяць...
Сумна гэта ўсё, як на пажары,
Дзе ў суседнім доме на гітары
Хтось іграе і віно смакуе,
І жанчыну, як пажар, цалуе.
І нічога не змяніць нікому.
Можна сёння не прыйсці дадому,
А пайсці і сесці ў электрычку,
Падчапіць, як насмарк, маладзічку
І паехаць з ёю на прыроду
Падалей ад смерці і народу.
Можна ўсё, але праз год, праз дзесяць
Усё роўна ўсё ж цябе павесяць.
І вісець ты будзеш на асіне.
Міма будзе ехаць на машыне
Чалавек, які цяпер гаруе
І тайгу сібірскую пілуе,
Бо ўсё роўна ці праз год, праз дзесяць
Не яго тут, а цябе павесяць...
Сумна гэта ўсё, як на пажары,
Тлумна гэта ўсё, як на базары,
І нічога не змяніць нікому,
Як не легчы мне ў труну жывому...

x x x

Ларысе Генюш

Воля на чужыне,
На Радзіме краты.
Выбар-- невялікі,
Толькі выбар ёсць.
Вецер сумна вые,
Воўчы цень ля хаты
У зубах трымае,
Згаладалы, косць.

Зойдзе цень на ганак--
Не кажы нічога.
Добра што на свеце
Ёсць яшчэ сябры.
Свечка асвятляе
І крыжы, і Бога.
Свечка светла плача,
Свечка не гарыць.

А навокал цёмна,
Нібы ў дамавіне.
А навокал цені,
А навокал-- сон.
Толькі вецер вые.
Вецер у Айчыне
З могілак узняты
Крыламі варон.

І пачата споведзь
Прад людзьмі і Богам.
І пачуты словы,
І пачуты крык.
Толькі на Айчыну
Помніцца дарога,
Дзе ў руцэ Айчыны
З дыяменту цвік.

x x x

Мы жывём не помнячы, што свет
Чорны, як забойцы пісталет,
Ад якога не схавацца анідзе
Ні ў агні, ні ў Храме, ні ў вадзе,
Бо жывём не помнячы, што мы,
Быццам снег напрыканцы зімы,
Што з”явіўся і праз міг растаў,
Нат не зразумеўшы, што лятаў
Над зямлёю чорнай, як нябыт,
Светлай, як падпалены Мадрыд,
У якім мы не былі з табой,
Так, як снег ліпнёваю парой,
І таму нам хочацца пажыць,
Быццам бы цыгарку закурыць,
Гледзячы, як снег ляціць з аблок,
Быццам кулі белыя ў вісок.

x x x

Зноў мой сум, як туман над маёю дарогай,
На якой не было цэлы век анікога
І не будзе ніколі, як не будзе й мяне,
Калі сум мой, як гэты туман, не міне.
Сумна мне і нікому пра сум не сказаць,
Бо пачнуць пасміхацца і жыць павучаць,
Толькі я ўжо вучоны і я знаю даўно,
Што ніхто не глядзіць так, як маці ў вакно,
У вакно, праз якое жыццё не відно.
І дарога дадому, чым у свет, карацей,
Бо да маці іду, бо іду да людзей,
І мне хочацца плакаць, і мне хочацца жыць,
І апошняму злыдню пра свой сум гаварыць...

ТАПЕЛЕЦ

На чорных крылах хваль плыве тапелец сіні,
Вароны кружацца галодныя над ім.
А хамы на ўзбярэжжы, як на градах свінні,
Балююць сыта, не бядуюць ні аб чым.

Ганяе вецер, быццам прывіды, газеты,
За імі мухі злосна чорныя гудуць.
Гніюць смярдзюча ў травах агуркі, катлеты.
А пляшкі-- п”юць ратамі бітымі ваду.

А ён плыве, абняўшы плынь рукамі,
Цяжкі, як лёс, які не варты і граша.
Глядзіць спакойна ў неба чорнымі вачамі,
Дзе каняй шэрай лётае, крычыць душа.

Да берага прыплыў, а хамы спяць, як свінні,
І сыты храп, як пыл, ляціць па свеце ўсім.
І б”ецца ў бераг галавой тапелец сіні,
Вароны звар”яцела каркаюць над ім.

х х х

Холадна. Змрочна. Дажджліва...
Гэта не восень, а -- лета.
П”ю зледзянелае піва
З шумам начнога буфета.

З”ехаць адсюль бы, прапасці,
Тыдняў ну хоць бы на пару!
З”ехаць адсюль-- мо і шчасце,
Ды ці пра гэта я мару...

Зноў за вакном на пероне
Вецер ганяе лістоту.
Вецер хай хмары разгоне,
Хай з мяне вырве самоту!

Холадна. Змрочна. Дажджліва...
Вось і канчаецца лета.
П”ю зледзянелае піва,
Быццам свінец з пісталета.

x x x

Самотных вершаў не пісаць,
Нібыта праўды не казаць,
А танцаваць на рэштках Храма,
Куды мяне вадзіла мама
Да споведзі, як да святла,
І споведзь, нібы верш была...

Самотных вершаў не пісаць,
Нібыта ад сябе ўцякаць,
Нібыта пальцы адсякаць,
Не думаць, што ўсё гэта грэх,
Які не знікне, нібы снег...

Самотных вершаў не пісаць,
Нібы Іуду цалаваць...

## БАЛАДА ВОЛІ

Не пускайце мяне вы на волю,
Не шапчыце пра волю вы мне,
Бо люблю сваю сумную долю,
Нібы костачку вішні ў віне.
А дзе воля-- ніхто з вас не знае
І ніколі не будзе ўжо знаць,
Бо над вамі ўжо д”ябал лятае
І ў вас вочы, як пекла, гарàць.
Не пускайце мяне вы на волю,
Бо я волі баюся, як вы,
Бо я ваш, бо я з вашага поля,
Дзе ўздымаецца попел сівы
Аж да хмар са згарэлага Храма,
У якім не маліліся мы,
А малілася нашая мама,
Каб не зналі сумы і турмы
Адзінокія сумныя дзеці,
Што хацелі, каб лепей было...
Не ўтрымаць вам мяне, бо я-- вецер,
І ў віне я не бачу святло...

## КАЗКА ПРА ВАЎКА

Вецер у полі агонь раздзімае,
Попел да неба, як слуп, уздымае,
І ўжо, здаецца, на слупе на тым
Неба стаіць, як на вогнішчы дым.
Воўк ля агню пасівелы сядзіць,
Быццам бы ідал, на поле глядзіць.
Воўк адзінокі сем дзён не засне,
Будзе маўчаць у чаканні мяне.
Толькі мне ў поле цяпер не хадзіць--
Попелу слуп там да неба стаіць.
Выйдзе з хаціны сп”янелы сусед,
Лаючы жонку і ўвесь гэты свет,
Пойдзе праз поле адзін да ваўка,
Не задрыжыць у суседа рука...
Воўк перад смерцю, як д”ябал, завые,
Пырснуць у прыску вуглі залатыя...
Будуць у хатах суседзі сядзець
І на суседа праз шыбы глядзець.

## КАЗКА ПРА АПОШНЯГА П"ЯНІЦУ

Гразёй аблеплены платы
І вуліца, нібы канава.
"Апошні п"яніца-- святы,
Яго ахоўвае дзяржава"--
Пра гэта ведаюць усе.
Няма на п"яніцу праклёну.
Дадому пляшку ён нясе,
Нібы кароль сваю карону.
За ім бягуць сабакі ўслед
Ягонай каралеўскай світай.
Ён не кляне наш грэшны свет,
Ён ведае, што ўсё прапіта.
Ён прыйдзе радасны дамоў,
І падабранымі са смецця
Партрэтамі бальшавікоў
Распаліць печку, будзе грэцца...

## БАЛАДА ВЯРТАННЯ

Я сягоння ў дзяцінства вярнуцца жадаю,
Не таму, што там добра, маломую, было,
А таму, што па сцежках бацькоўскага краю
З хаты ў хату цякло Беларусі святло,
Ад якога святлелі самотныя хаты
І хацелася быць, і хацелася жыць,
І спявалі ля рэчкі пра Яся дзяўчаты,
І пускалі вянкі, і хацелася плыць
За вянкамі ў нязведаны свет за лясамі,
Не таму, што там добра, напэўна, было,
А таму, што дабрэйшымі мы былі самі
І па сцежках цякло Беларусі святло,
Ад якога святлелі самотныя хаты...
І мне хочацца быць, і мне хочацца жыць,
Бо яшчэ хоць цішэй, ды спяваць дзяўчаты
І ў нябёсах высокіх белы бусел ляціць.
Але ўсё ж у дзяцінства вярнуцца жадаю,
Не таму, каб там жыць, а каб дзеду сказаць,
Што няма ўжо даўно таго сумнага краю,
За які ён хадзіў два разы ваяваць...

x x x

Засыпаны снегам дамы і платы,
Засыпаны снегам былыя гады,
Дзе мы маладыя, як сённяшні снег,
Які заўтра будзе вадою са стрэх
Сцякаць на зямлю і ў зямлі прападаць,
Каб снегам ізноўку, хоць некалі, стаць.
Засыпаны снегам дамы і платы,
І ты сярод снегу, нібыта святы,
Ідзеш без дарогі па белым святле,
Нібыта па хмары, па белым сяле,
Якое тут ёсць, быццам сённяшні снег,
Які заўтра будзе вадою са стрэх
Сцякаць на зямлю і ў зямлі прападаць...
Вятры, як нябачныя дрэвы, шумяць,
І снег, быццам белыя птушкі, ляціць.
І хочацца плакаць, і хочацца жыць
У гэтых засыпаных снегам дамах,
Нібыта ў далёкіх забытых гадах,
Дзе мы маладыя, як сённяшні снег,
Які заўтра будзе вадою са стрэх
Сцякаць на забытую Богам зямлю,
Якую, як ты, я таксама люблю
За гэтыя ў снезе дамы і платы,
За тыя, што тут адшумелі гады...

## АПОШНІ ДЗЕНЬ

Апошні дзень дваццатага стагоддзя...
Цярусіць снег. Туман. Разводдзе,
Нібы вясной, якая сніцца нам.
Праз белы снег, нібы праз белы Храм,
Іду дамоў, шукаючы свой дом
Напоўнены самотай і святлом,
Нібыта новы Ноеўскі каўчэг,
Што праплыве праз слёзы і праз смех,
І новы дзень пральецца з тых вакон,
Дзе свечкі не патухлі ля ікон.
Апошні дзень дваццатага стагоддзя...
Віна з сябрамі выпіць не зашкодзіць,
Але нікога дома з іх няма.
Іду дамоў і ўслед ідзе зіма,
І вецер мокры з-пад кустоў паўзе,
І ліхтарамі на слупах трасе.
Але не страшна, бо іду дамоў,
Як гэты снег, што на зямлю сышоў,
Каб заўтра пад нагамі ў нас растаць...
Апошні дзень...
Не трэба сумаваць!

x x x

Вар"яцкія вершы паэта-вар"ята,
Нібыта ў агні яго родная хата,
Мне ноч асвяцілі вар"яцкім святлом,
Нібыта ўспаміны страшныя прад сном
У гэтай начы, дзе так страшна заснуць,
Нібыта па венах нажом паласнуць.
Вар"яцкія вершы паэта-вар"ята,
Нібыта каханне вядзьмаркі і ката,
Чытаю і плачу, і сам вар"яцею,
Што так па-вар"яцку пісаць я ці ўмею
Пра наша жыццё, што нявечна, як сон,
Як гэтая ноч, што стаіць ля вакон
Кватэры маёй, маёй светлай турмы,
Дзе можна схавацца ад шэрай зімы
І, вершы чытаючы, мроіць пра лета,
Што дыхае ў рыфмах вар"ята-паэта...

x x x

Вялікая, самотная Расія,
Заўсёды ў золаце і ў лахманах,
Глядзіш удалечы табе чужыя,
Нібы на голае дзяўчо манах.
А мы не ўдалечы, мы прад табою,
Не бойся, мы нікуды не ўцячом
І не знясём сваю зямлю з сабою
Ні ноччу цёмнай, ні найсветлым днём.
Вялікая, самотная Расія,
Як многа азіятчыны ў табе,
Ды гарады люблю твае малыя,
Дзе ў ноч на вадасцёкавай трубе
Іграе вецер Глінку для паэта,
Які прыехаў не з краёў чужых,
А з светлага бярозавага лета,
Дзе многа прыгажуняў маладых,
Што хочуць годна жыць пад родным небам,
Дзе вечна продкі нашыя жылі,
Якім зямлі чужой было не трэба,
Ды не цураліся сваёй зямлі.
Вялікая, самотная Расія,
Вялікай будзь, як боскія дамы,
Не з-за таго, што знікнем мы, “малыя”,
А з-за таго, што будзем мы!

НАША ВІЛЬНЯ

Людміле

Тут старыя, як вечнасць, дамы.
Пад асфальтам каменне знямела.
Нібы цені, знямелыя мы
Зноў па вулках блукаем нясмела.

І над намі стагоддзяў вятры
Пралятаюць, абсыпваюць пылам.
Нашых продкаў шчэ помняць муры,
Нашых продкаў тут кроў і магілы.

І над Вільняй Пагоня ляціць,
І яе не стрымаць анікому.
І душа, нібы рана, баліць,
І душа зноў не хоча дадому.

І, шукаючы продкаў сляды,
Мы заходзім у Храмы святыя,
І цалуем мы ногі святым,
І цалуем крыжы залатыя.

x x x

Зялёнае святло лістоты
Ізноў трапеча за вакном
Пад небам, дзе плыве самота
На хмарах з маладым дажджом.
І ты глядзіш адзін у неба,
І ў неба просіцца душа,
Якой, як птушцы, лётаць трэба
Пакуль ты да свайго крыжа
Ідзеш па гэтым тлумным свеце,
І разумееш, што жыццё
Адно, як гэты цёплы вецер,
Як гэта ля вакна лісцё,
Што не паўторацца ніколі,
Але запомняцца душы,
Нібы святло на кволым голлі,
Нібы Хрыстос, што на крыжы...

x x x

“Што стане лепш жыццё, абрыдла спадзявацца,
Бо і сягоння трэба есці й апранацца”--
Гаворыш ты, не помнячы зусім пра тое,
Што нашае жыццё і не было другое,
Бо вечна спадзяваліся на пана-Бога,
Не робячы, каб лепш было, амаль нічога.
І ў краму ты ідзеш, каб зноў хутчэй напіцца,
На нейкі момант адурнець і асляпіцца,
Пра ўсё забыцца і адчуць, што ты на свеце,
Як восенню лісцё, як у скляпенні вецер,
Нявечны, адзінокі, як дыханне маці,
Якую ты яшчэ пакуль зусім не страціў...

Ідзеш, але яшчэ ты можаш азірнуцца,
Яшчэ спыніцца і дамоў вярнуцца...

ЗГУБІЦЦА...

Згубіцца ў восеньскім густым тумане,
Нібы згарэць у восеньскім агні,
Нібы разбіцца на аэраплане,
Упаўшы з неанёльскай вышыні,
Хацела ты, прачнуўшыся далёка
Ад горада, дзе вечна тлум і дым.
А тут ля вокан лётае сарока
І нас заве ў бярэзнік залаты,
Нібыта ў Храм, дзе нас даўно з табою,
Шчаслівых, як ніколі, не было.
Згубіцца, каб застацца, быць з ракою,
Дзе стронга, як застылае святло.
Згубіцца і глядзець у цемру неба,
І не баяцца, што жыццё міне
І будзе нам нічога ўжо не трэба,
Як пылу, што прыгрэўся на вакне.

х х х

Сёння шчэ восень, а заўтра-- зіма,
Сёння шчэ воля, а заўтра-- турма.
Сумна ўсё гэта, як зломаны крыж.
Ты праз вакно, як праз неба, глядзіш
На адзінокіх людзей, што ў двары,
Быццам бы мышы ў каменнай нары,
Сонна шнырують, не помнячы, што
Самі яны-- гэта тое святло,
Што адшукаць яны хочуць даўно,
Гледзячы ў неба, нібыта ў вакно,
Дзе яшчэ восень, а заўтра-- зіма,
Дзе яшчэ воля, а заўтра-- турма,
І анічога табе не змяніць.
Праўда, ты можаш смяротна запіць
І не вярнуцца з кавярні дамоў.
Толькі ты сёння на двор не пайшоў
І праз вакно, як праз неба, глядзіш
І, нібы з неба, з вакна ты зляціш,
Можа і сёння, а можа й пасля,
Як з-пад снягоў зноў прагляне зямля...

х х х

Ты ведаеш даўно, што мы памром,
Праз вуліцы, залітыя святлом,
Сплывём, як воск са свечак у царкве,
Як у зямлю сплывае па траве
Раса, сабою жывячы траву,
Што й на магілах шэпча нам “жыву”.
І хочаш жыць ты, як жыве трава
На вуліцы, дзе белая царква
Стаіць, як па-над свечкай белы дым
Стаіць нябачны ў ночы анікім,
Бо гэты дым з малітваю плыве,
Бо гэты дым, нібы анёл, жыве
У Храме, праз які аднойчы нам
Праплыць, як дыму праплываць праз Храм,
Праз вуліцы, залітыя святлом,
Праз думкі, што асветлены крыжом,
У свет стары, па-над якім трава,
У новы, на якім стаіць Царква...

х х х

З Мінска я на Маладэчына зноў еду,
Нібы ў жыццё з таго вяртаючыся свету,
Нібы ўсплываючы з праклятай глыбіні,
Гляджу на ліхтароў анёльскія агні,
Што ў вёсках, як вуголле ў прысаку, ізноў
Сярод вячэрняга туману і кустоў
Гарацць, мне асвятляючы мой даўні шлях,
І слёзы абуджаючы ў маіх вачах,
Гараць і гаснуць за знямелымі кустамі,
Як майскія жукі пад мокрымі лістамі.
Гараць і гаснуць, гаснуць і гараць ізноў,
Бо з Мінска я вяртаюся ў начы дамоў,
Каб зноўку там адчуць, што я яшчэ жывы,
Як цень дрыготкі ад палын-травы...

ВАКНО

вакно самае безабароннае месца ў доме
праз яго як праз рэшыта
з неба працякае святло
і працякае цемра ў мой свет
і як просячыся ў неба
якое стварылі людзі
стукаецца аб шкло матыль
нібыта душа засохлай ружы
што ляжыць на маім стале
вакно гэта мой квадрат
які бывае чорнага колеру
як у Казіміра Малевіча
які бывае якім бываю я
вакно гэта вітрына майго жыцця
дзе суседскія вокны
гэта толькі вокны
з якіх выцякае святло і змрок
знікаючы ў Леце часу
вакно гэта прорва
у якую можна кінуцца
і на хвілю спазнаць тое
што называецца самагубствам
вакно гэта люстэрка
у якое глядзіцца бяроза
што стоячы ля майго вакна
пакідае мне ў сваім галлі вакно
маё вакно ў Еўропу

x x x

Начныя вуліцы залітыя святлом,
Нібыта руслы рэк залітыя віном
Краіны райскай, што начамі сніцца нам
У гэтым свеце, што даўно не Храм,
А дымная майстэрня п”яных шкаляроў,
Што любяць гаварыць пра грошы і любоў.
Начныя вуліцы залітыя святлом
Люблю, як вершы Блока, пачытаць прад сном
І ў вуліцах згубіцца, быццам патануць
І быццам у краіну райскую зірнуць,
І ўбачыць руслы рэк залітыя віном,
Нібыта вуліцы залітыя святлом,
Дзе я адзін іду, нібы плыву, дамоў
Ад маладых жанчын і п”яных сябрукоў,
Каб зноўку вершы Блока перад сном чытаць
Пакуль начныя вуліцы не спяць...

x x x

Калі зноў пачынаюцца дажджы
І божы дзень, нібыта ноч сівая,
На сцежцы палявой растуць глыжы,
Нібы сцяна з нябыту прарастае
Старога замка, што раней тут быў
І ад чужынцаў бараніў краіну,
Самотную, нібыта дым, што сплыў
Ад вогнішча, якое Бог пакінуў
І ў дождж пайшоў, зрабіўшыся дажджом,
Які размыў дарогі палявыя
І цішыню налітую святлом,
Дзе мы былі, як матылі начныя,
На сцежцы, на якой растуць глыжы,
Нібы сцяна з нябыту прарастае
У божы дзень, калі ідуць дажджы,
Калі душа душу, як рай, шукае...

x x x

Нібы на кол асінавы, і ты
Нарэшце ўсё ж пасаджаны на страх.
Сум незямны ў тваіх крычыць вачах,
Нібы пажар з халоднай цемнаты
Ірвецца ўвыш і асвятляе выш,
Куды даўно ты болей не глядзіш.
І гэта ноч, нібы сусвету дно,
З якога анікому не відно
Цябе, што хоць яшчэ пакуль жывы,
Ды не жывей на вуліцы травы,
Што стопчыцца, разветрыцца, як тло,
Нібы травы зусім і не было.
А ты жывеш, і думаеш пра страх
І страх пажарам на сямі вятрах
Расце і ў ім ужо згараеш ты
Сабой не спапяліўшы цемнаты
І толькі сум твой незямны крычыць
Аб тым, што нельга болей гэтак жыць...

х х х

...У зіме адзінокія мы,
Як у вёсцы старыя дамы,
У якіх аніхто не жыве.
І самотна глядзім мы на свет,
Як прад выстралам на пісталет
На дуэлі няшчасны паэт,
У якога няма ў галаве
Думак светлых пра гэта жыццё.
І, як воўчае ў полі выццё,
У начы пад вакном гул машын.
А над горадам, нібы мурын,
Самалёт абгарэлы ляціць.
Ёсць гарэлка і можна запіць,
Каб забыцца, што сёння зіма,
Што цябе тут са мною няма,
Нібы думак вясёлых пра свет,
Дзе з дуэлі няшчасны паэт
Адзінокім вярнуўся дамоў,
Нібы воўк, што ўцякаў ад ваўкоў...

x x x

Лёгкі снег замятае зямлю,
Снег цяжкі цёпла шэпча “люблю”
І мы ў снезе знікаем густым,
Нібы ў воблаках Ерусалім,
У якім нам ніколі не быць,
Бо нам гэтае поле любіць,
Праз якое дарогі няма
З каралеўства на выспе Зіма.
Белы снег замятае жыццё,
Як на вуліцах менскіх смяццё
Замятаецца аж да вясны,
Ля якой мы стаім, як сцяны,
За якой невядомы нам свет,
У якім ці патрэбен паэт,
Што самотны, як снег, што ляціць
На зямлю, каб палёт свой любіць
І не помніць далёкіх аблок,
Як не помніць сябе матылёк
Напачатку зямнога жыцця...
Ты смяешся, бы ў Храме дзіця,
У зіме адзінокай, як мы.
Там за полем старыя дамы
І да іх нам ісці праз снягі,
Як рацэ вясной праз берагі.
І мы ў снезе не знікнем густым,
Як не знік у пясках Ерусалім...

БАЛАДА ВЯРТАННЯ БАГДАНОВІЧА

Максім Багдановіч... Максім,
Самотны, нібы пілігрым,
Які хоць вярнуўся дамоў,
Ды толькі свой дом не знайшоў,
Як нельга магіл адшукаць,
Дзе рыцары нашы ляжаць...
Максім Багдановіч... Максім,
Мы разам з табою лясцім
Да зорак, што светла гараць
У небе, куды не глядзяць
Самотныя людзі з вакон,
Счарнелых, як лікі з ікон...
Максім Багдановіч... Максім,
Жыццё сёння наша, як дым,
З якога не бачна жыцця,
Нібыта не бачна лісця
На дрэвах, што ссохлі вясной,
Калі развітацца з табой
Нам дадзена лёсам было...
Але не прапала святло,
Якое ты нам запаліў
На гэтай балотнай зямлі,
Дзе мы тут спрадвеку былі
І будзем, як гэты прастор,
Як гэта імкненне да зор...
Максім Багдановіч... Максім...

х х х

Ад нас застануцца не нашы пасады,
А нашы дарогі і нашыя хаты
Ад нас застануцца... Без нас застануцца...
Назад не вярнуцца... Дамоў не вярнуцца,
Каб нешта з”іначыць, каб нешта сказаць.
Мы будзем усе пад крыжамі ляжаць,
А з часам не будзе й над намі крыжоў,
Самоты не будзе ў Краіне дажджоў,
Якую з табой мы ствараем даўно,
Смакуючы каву і сонна ў вакно
Падоўгу глядзім і не бачым вясны,
Якая прыходзіла ў нашыя сны,
У нашыя мары, якімі жылі,
Калі мы з табой маладымі былі..
Ад нас застануцца не нашы пасады
І будзе смяяцца з нас дзядзька багаты,
І сонца загляне ў Краіну дажджоў,
І дрэвы зноў вырастуць з нашых крыжоў...

ЛЕТА ПРАЙШЛО...

...Счарнела вуголле і дым,
як ссівелы крумкач,
адляцеў
І холад на лёзах травы
паразвесіў расу маладую.
І ноч, быццам кроў,
праступіла
праз вату зялёную дрэў,
За мной пацякла,
як пясок, размываючы ціш нежывую.

Вярнуцца ніколі не позна,
было б жа вяртацца куды.
І вернецца лета,
але толькі лета ўжо будзе не тое
І я ўжо не буду,
як гэта на травах раса,
малады
І пад ногі ўпадзе з дрэў лісцё,
як агонь, залатое.

Вярнуся дамоў,
быццам бы апякуся,
прачнуся ад сну,
І ўбачу, што лета прайшло
і мяне тут ніхто не чакае,
І ў вокны сляпыя,
нібыта ў той свет,
як крумкач, зазірну
І самота мяне абаўе,
быццам камень-- змяя маладая.

БАЛАДА ГАБРЭЯ

Ты з лёсам змірыўся, калі стаў старэй,
Ты ўчора быў рускі, а сёння-- габрэй,
Але ў сінагогу ты ўсё ж не пайшоў--
З дзяцінства прывык да славянскіх крыжоў,
Да сала, гарэлкі, распусных жанчын.
Адно што не любіш-- савецкіх машын.
Іосіфа Бродскага вершы чытаеш,
Нібы залатое вуголле глытаеш
І плачаш, і курыш смярдзючую “Астру”,
І кашляеш доўга-- хварэеш на астму.
Мы часта з табой ля пад”езда сядзім
І ты мне гаворыш пра Ерусалім,
Табе я пра Вільню сваю гавару
Няспешна, нібыта іду на гару,
З якой можна ўбачыць нязведаны свет,
Прыгожы і сумны, як мамы партрэт,
Што быццам абраз, у цябе на сцяне,
А мама сама засталася ў вайне...

Ты з лёсам змірыўся, калі стаў старэй,
Ты ўчора быў рускі, а сёння-- габрэй...

х х х

...І трэснула неба, як шкло на іконе,
І свет раздзяліўся на Заўтра і Сёння,
І людзі завылі сівымі ваўкамі,
І зоркі з нябёс папаўзлі павукамі
На нашу зямлю, як на мошку малую,
Якой больш не лётаць, але шчэ жывую.
З забытых магіл мерцвякі паўставалі
І травы, нібыта зялёныя хвалі,
На міг ускіпеўшы, заціхлі, зжаўцелі.
Як д”яблы, з асінаў лісты паляцелі
І селі на Храмы, і Храмы прапалі,
Нібыта ільдзіны пад сонцам расталі...
І раптам аднекуль ты мне пазваніла,
І сон мой, нібыта люстэрка, разбіла,
Куды я глядзеў і не бачыў, што Сёння
Пакрылася пылам, як шкло на іконе...

х х х

Не хочацца бывае нават жыць
Не тое што паўмёртвы край любіць,
Дзе мы з табой самотныя даўно.

Па радыё зноў хваляць маскалёў,
Суседка зноў прасіла сто рублёў,
Ёй вечна не хапае на віно.

А мы з табой гаворым пра народ,
Які ніяк не выпаўзе з балот
Хоць і даўно балоты асушыў.

І мы жывём, нібы атруту п"ём,
І любім свой маленькі ціхі дом,
Дзе мы жывём, нібыта ў шалашы.

x x x

Нарэшце дачакаліся цяпла...
Нібы ў душу патрапіла страла,
Што прыляцела з прамінулых год.

У выш гляджу, як воўк на лес, гляджу,
Як жыць хачу, хачу хутчэй дажджу,
Які ажывіць, як траву, народ.

Хацець-- не грэх, але чаго няма
Таго й са свечкай тут шукаць дарма,
А ў нас жаданняў хоць ты прадавай.

І ты бяжыш пад сонца ўсё хутчэй,
Ды ўжо разліты на твой шлях алей
І ўжо грукоча, нібы гром, трамвай...

2000

Гэтай ноччу і вечнасць прайшла,
Бы віно мы з табой дапілі
З пляшкі той, дзе атрута была.
Мы памерлі. І мы ажылі.
І глядзіш ты, як прывід, на свет
І не бачыш у свеце мяне,
Дзе на снезе лятучым партрэт
Твой вісіць, быццам бы на сцяне,
Да якой мне ісці праз вятры
І не знаць, што спадман прада мной,
Пра жыццё, як пра смерць, гаварыць
І стаяць, як туман, прад сцяной,
За якой анічога няма,
Як віна, што з табой дапілі.
І цябе я шукаю дарма.
Мы памерлі. І тут не былі.

НАЧНАЯ БАЛАДА

Цёмныя людзі на вуліцах цёмных,
Быццам нашчадкі сабакаў бяздомных,
Ноччу блукаюць, шукаюць святло,
Быццам калісьці святло тут было
І на слупах на бетонных вісэлі,
Нібы матросы-паўстанцы на рэі,
Белыя, быццам сцягі, ліхтары.

Нібы Кітайскія сцены, муры
Свет гарадскі раздзяляюць каменна.
Цёмныя людзі блукаюць ля сценаў.
Страшна выходзіць на вуліцу нам,
Выйдзем з табою і пойдзем у Храм,
Каб там за цёмных людзей памаліцца.
Можа й яшчэ хто начы не збаіцца,
Можа й яшчэ хто падасць ім святла...

Знічка зляцела, бы ўпала страла,
З цёмных далёкіх забытых гадоў,
Дзе нас няма, дзе ёсць смерць і любоў.

х х х

Нам заўтра дадому вяртацца
Ад сонцам напоўненых сосен,
Дзе спее туманная восень,
Дзе шышкі, як пчолы, раяцца...

Нам заўтра дадому вяртацца
Да цесных і змрочных пакояў,
Да ідалаў і да герояў,
Каб плакаць, маўчаць і смяяцца...

Нам заўтра дадому вяртацца
Праз лета, праз дождж і праз вечар,
І будзе за намі ўслед-- вецер,
І пыл будзе ў неба ўздымацца...

Нам заўтра дадому вяртацца
Ад спёкай напоўненых сосен
У горад, у холад, у восень,
Каб зноў у вандроўку збірацца...

Нам заўтра вяртацца...

x x x

Гартаю пажаўцелыя выданні,
Самотныя, як вершы аб каханні,
Якое адыйшло, як дзень вясновы...

Чытаю вершы, як цалую словы,
Каб словы ажылі і ў свет ляцелі...

Гартаю дні, якія адшумелі,
Як восеньская мёртвая лістота,
Якой і мёртвай шчэ пажыць ахвота.

x x x

Мы не пыл, мы не дым, мы не сон,
Мы-- святло з пачарнелых вакон,
Мы-- трава на магілах дзядоў,
Мы-- вада ад расталых снягоў.
І шумяць па-над намі вятры,
І лятуць па-над намі муры,
У якіх нам ніколі не быць
І таму іх нам век не любіць,
Быццам пыл, быццам дым, быццам сон...
Нас чакае штодзённа Харон,
І скрыгочам мы ў вечнай начы,
Бы ў замках, што на Храмах, ключы...

x x x

Я не прывыкну да дажджоў ніколі,
Як не прывыкнуць душам да турмы,
Якія зведалі грахоўнасць волі
І помняць шлях ад дому да карчмы.
А дождж ідзе, як Божы суд, бясконцы,
І мёртвы бруд змываецца з зямлі.
І лісце жоўтае, як рэшткі сонца,
На чорнай, нібы некралог, раллі.
І я гляджу з вакна, як з дамавіны,
Якая ціха праз патоп плыве.
І я шапчу імя сваёй жанчыны,
Якая невядома, дзе жыве,
І любіць дождж. За што? Сама не знае
І знаць не хоча, бо жыццё ідзе
І хвілю кожную ў нябыт знікае,
Як бруд, як лісце жоўтае ў вадзе.

x x x

Стаміўшыся ад вечнасці зямной,
Ты ў свет пайшоў асветлены царквой,
А новы дзень пачаўся, як заўжды,
Нібы на свеце аніколі ты
Не быў, як аніколі ўжо не быць,
Не плакаць, не смяяцца, не любіць
Пад гэтым небам, дзе жыццё і тло
Штохвілі п”юць аднолькава святло
Пакуль яшчэ ёсць я, пакуль быў ты.
Ізноў вясною расцвілі сады
І птушкі зноў вярнуліся да нас,
І заспявалі, як апошні раз.
І я іду, самотны, у царкву
Праз туманы, як белую траву,
Пакуль стамлюся вечнасцю зямной,
Пакуль не ўбачу хто ідзе за мной…

З ЦЫКЛА “ЧЫРВОНЫ ЛІХТАР”

## БАЛАДА АФРЫКАНСКАЙ ПРЫНЦЭСЫ

Ты хацела з”ехаць за мяжу
Падалей ад снегу і дажджу.
І цяпер за вокнамі пясок
І вярблюд слінявы, і сынок
Чорны, як савецкі гуталін,
Смокча пераспелы мандарын
І па-руску лаецца з сястрой
Белай, як казіны сырадой.
Ну а муж хоць негар, ды ўсё ж твой,
Вызваленчай арміі герой,
Дзесьці ў джунглях корміць камароў,
З баявой сяброўкаю любоў
Круцячы, не думае як ты
Тут жывеш без мужа, без вады...
І глядзіш ты мёртва на пясок,
Дзе вярблюд слінявы і сынок,
І табе ахвота за мяжу
Бліжэй да снегу і дажджу.

## БАЛАДА АДНОЙ

Ты ў Доме творчасці адна жывеш,
Нібы ў блакноце пра каханне верш
Сярод санэтаў і паэм пра лета
Самотнага не менш цябе паэта.
Ты ў змрочным бары выпіла б віна,
Калі б ты не была ў начы адна,
Як гэта ноч, дзе зорак не відно,
Як на стале разлітае віно.
І ты сядзіш над кніжкай невясёлай,
А ўжо магла б ляжаць на ложку голай
І вершы слухаць п”янага паэта
Пра цёплае, як пацалунак, лета.
Ды ты адна жыла і пражывеш,
Нібы ў блакноце пра каханне верш.

## ДАЛЯРНАЯ БАЛАДА

Ён жаніўся на суседцы Сары,
Палюбіўшы Сарыны даляры.
Тры гады ён ездзіў на таксі,
Вылезшы з савецкае гразі.
Ды аднойчы ён, нібыта цар,
Заглянуў у прыдарожны бар,
І напіўся там, заначаваў
І вусатай бабе абяцаў
Ажаніцца за каханне ноч.
Раніцай не мог расплюшчыць воч
І не мог успомніць дзе і што,
І, прапіўшы шчэ даляраў сто,
Ён на тыдзень загуляўся ў бары,
Раскідаўшы, як смяццё, даляры.
І калі праспаўся, ён пайшоў,
Як сабака збрыдлівы, дамоў.
І прыйшоў дамоў, а там-- замок,
І званіў ён аж паўдня ў званок
Покуль выглянуў стары сусед...
І пайшоў ён, і пачуў услед:
--Так табе і трэба, паразіт,
Больш не плюй на Сару і іўрыт!

## МІНСКАЯ БАЛАДА

“Люблю мінчанак маладых,
Ад іхніх ног займае дых...”--
Гаворыць сябра і ўздыхае
І поўны келіх выпівае.
І сёння бар яму, як рай.
Музыка, грай! Музыка, грай!
І не глядзі, што мы п”яныя,
Галоўнае, што мы жывыя
І разумеем прыгажосць.
А ў прыгажосці-- д”ябал ёсць.
--О як бы іх я распранаў!
О як бы іх я цалаваў!--
Гаворыць сябра, вар”яцее

І многа п"е, а піць-- не ўмее,
Але ўсё ж помніць пра дзяўчат.
На іх кідаючы пагляд,
Зноў поўны келіх налівае.
Душа жыве, душа спявае:
--Люблю мінчанак маладых,
Ад іхніх ног займае дых...

## З ЦЫКЛА "МЫ ПРЫДУМАЛІ..."

### БАЛАДА ЕЎРОПЫ

Мы сабе прыдумалі Еўропу
І, ад азіяцкага патопу
Збудаваўшы з мроіва сцяну,
Аддаліся незямному сну,
У якім салодка сніцца воля,
Як трава, што вылезшы з зямлі
Пра зямлю не думае ўжо болей,
Быццам травы па-на ёй былі
Вечна і ўжо будуць вечна травы
На шляху з Разані да Варшавы,
У якой, спыніўшыся ў карчме,
Мы сядзім, як быццам бы ў турме,
А дамоў не хочам мы вяртацца,
Бо там будуць з нас усе смяяцца,
Што сабе прыдумалі Еўропу
І ад азіяцкага патопу
Думалі схавацца за сцяной,
Як ад Бога мёртвы-- пад зямлёй...

### БАЛАДА КРАІНЫ

Мы сабе прыдумалі Краіну
І, самотныя, туды ўцяклі.
Як анёл прыносіў Богу гліну,
Нам прыносіць роднае зямлі
Чорны воран, што кляваць нам вочы
Будзе, як забудземся хто мы

І чаму ў далёкім свеце воўчым
Мы свае пакінулі дамы...
Мы сабе прыдумалі Краіну
І Краіны гэтае няма,
Як зімой няма лісця ў асіны,
На якой павесіцца зіма.
Ну а воран чорны прылятае
І штодня прыносіць нам зямлю,
На якой Краіна прарастае
З боскіх словаў “Веру” і “Люблю”...
Мы сабе прыдумалі Краіну,
Як калісьці Бог прыдумаў нас
І яму анёл прыносіў гліну
Белую, як непачаты час...

## БАЛАДА СЯБРОЎ

Мы сабе прыдумалі сяброў,
Для якіх хоць зрэдку пра любоў
Трэба гаварыць, каб не прапалі,
Як з банкета пляшка Цынандалі,
Ля якой былі адны сябры,
Быццам бы більярдныя шары
На стале більярдным прад гульнёю,
Быццам апельсіны прад свіннёю.
Мы сабе прыдумалі сяброў,
Як намалявалі сто рублёў,
За якія анічога не купіць,
За якія могуць пасадзіць.
Мы сабе прыдумалі сяброў,
Быццам не вярнуліся дамоў
З невядомай, як банкет, вайны,
На якой былі сябры адны
І якія хутка ўсе прапалі,
Як прапала пляшка Цынандалі,
Ад якой ніхто не ап”янеў...

## БАЛАДА РАСІІ

Мы з табой прыдумалі Расію,
Бо Расіі той даўно няма,
У якой бароды шабляй брыюць
І стаіць, нібы француз, зіма
У Маскве і, палячы карціны,
Сонныя французы, як жанчыны,
Грэюцца на вуліцах начных.
Мы з табой прыдумалі краіну,
Дзе няма бальшавікоў жывых,
Ды навокал шнырацць азіяты
І славянскую псуюць нам кроў.
Ну а нам з табой ісці ў салдаты
І карміць магільных чарвякоў.
Мы з табой прыдумалі Расію,
У якой Масква-- не трэці Рым.
Нам за гэта чарапы абрыюць
І са свету выжывуць зусім,
Бо з табой прыдумалі Расію,
А Расіі той няма...

## БАЛАДА АМЕРЫКІ

Мы Амерыку прыдумалі з табой,
Белую, нібыта белы свет зімой,
І па белай па Амерыцы ідзём,
Быццам бы на воблаках у рай плывём.
І крычаць шчаслівыя індзейцы ўслед,
Каб вярнуліся, забралі пісталет,
Што ў начы згубілі, седзячы ў шынку,
Дзе нажом халодным па тваім баку
Аніхто не ўздумаў паласнуць, як звер...
Ды такой Амерыкі няма цяпер,
Ды такой Амерыкі няма даўно,
Што як дошкамі забітае вакно,
За якім ніколі нас і не было.
Мы яе прыдумалі, нібы святло
Уключылі, дзе зусім начы няма.
Белая Амерыка, нібы зіма...

# ЗМЕСТ

"За вакном Эўропа, белы сьвет..."
"Я грэшны, як вада, дзе сыпіць атрута..."
Балада пра сонца
У сьвяты вечар
Балада здрадніка
"Там, дзе вецер па вуліцах гоніць сьмяцьцё..."
Чорная балада
Зімовая балада
Балада Ноя
"Ня хочацца думаць, што мы ўсе памром..."
"Лета праходзіць, нібыта цягнік..."
У Доме Творчасьці
"Вечар затапіла навальніца..."
"Шагал над Віцебскам начным лятае..."
"...Пацяплела і хочацца жыць..."
"У гэтым дні хачу я затрымацца..."
"Вось і сонца за сосны зайшло..."
"Па Кальварыйскіх могілках хаджу..."
Балада апошняга князя
Балада Айчыны
Выкраданьне каханай
"Сумна жыць - бы глядзець на дарогу..."
Балада лёсу
"Воля на чужыне..."
"Мы жывём, ня помнячы, што сьвет..."
"Зноў мой сум..."
Тапелец
"Холадна. Змрочна. Дажджліва..."
"Самотных вершаў не пісаць..."
Балада волі
Казка пра ваўка
Казка пра апошняга п’яніцу
Балада вяртаньня
"Засыпаны сьнегам дамы і платы..."
Апошні дзень
"Вар’яцкія вершы паэта-вар’ята..."
"Вялікая, самотная Расея..."
Наша Вільня
"Зялёнае сьвятло лістоты..."
"Што стане лепш жыцьцё, абрыдла спадзявацца..."
Згубіцца...
"Сёньня шчэ восень..."
"Ты ведаеш даўно, што мы памром..."
"Зь Менска я на Маладэчына зноў еду..."
Вакно
"Начныя вуліцы залітыя сьвятлом..."
"Калі зноў пачынаюцца дажджы..."
"Нібы на кол асінавы..."
"У зіме адзінокія мы..."

"Лёгкі сьнег замятае зямлю..."
Балада вяртаньня Максіма Багдановіча
"Ад нас застануцца ня нашы пасады..."
Лета прайшло
Балада габрэя
"І трэснула неба, як шкло на іконе..."
"Ня хочацца бывае нават жыць..."
"Нарэшце дачакаліся цяпла..."
2000
Начная балада
"Нам заўтра дадому вяртацца..."
"Гартаю пажаўцелыя выданьні..."
"Мы ня пыл, мы ня дым, мы ня сон..."
"Я не прывыкну..."
"Стаміўшыся ад вечнасьці зямной..."

**З ЦЫКЛА "ЧЫРВОНЫ ЛІХТАР"**
Балада афрыкансай прынцэсы
Балада адной
Далярная балада
Менская балада

**З ЦЫКЛА "МЫ ПРЫДУМАЛІ..."**
Балада Эўропы
Балада краіны
Балада сяброў
Балада Расеі
Балада Амэрыкі

Філасофскі роздум над сутнасцю жыцця ісмерці, асэнсаванне лёсу Беларусі — асноўныя матывы гэтай кнігі.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год

© PDF: Камунікат.org, 2011 год